# *Секция 4.* **АКТУАЛЬНЫЕ ПРОБЛЕМЫ МЕТОДОЛОГИИ И МЕТОДИКИ ПРЕПОДАВАНИЯ ИСТОРИИ И СОЦИАЛЬНО-ГУМАНИТАРНЫХ ДИСЦИПЛИН**

## ПЕДАГАГІЧНЫЯ КАДРЫ СЯРЭДНЯЙ АГУЛЬНААДУКАЦЫЙНАЙ ШКОЛЫ БЕЛАРУСІ Ў ПЕРШЫ ПАСЛЯВАЕННЫ ВУЧЭБНЫ ГОД

***І. А. Андарала,***
*кандыдат педагагічных навук, дацэнт,*
*дацэнт кафедры гісторыі Беларусі і паліталогіі*
*ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт»;*
***А. І. Андарала,***
*кандыдат педагагічных навук, дацэнт,*
*дацэнт кафедры пегагогікі і псіхалогіі пачатковай адукацыі*
*ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка»*

У даваенныя гады ў Беларусі ў сувязі з ростам сеткі школ, абумоўленым хуткімі тэмпамі ажыццяўлення ўсеагульнага абавязковага пачатковага і сямігадовага навучання, мелася вострая патрэба ў падрыхтоўцы значнай колькасці настаўнікаў. З мэтай вырашэння гэтай праблемы ў рэспубліцы была створана рознаўзроўневая сістэма падрыхтоўкі педагагічных кадраў. Яна ўключала ў сябе тры тыпы педагагічных вучэбных устаноў:

– педагагічныя вучылішчы з трохгадовым тэрмінам навучання (на базе няпоўнай сярэдняй школы) – рыхтавалі настаўнікаў пачатковых класаў;

– настаўніцкія інстытуты з двухгадовым тэрмінам навучання (на базе сярэдняй школы) – рыхтавалі настаўнікаў 5–7 класаў;

– педагагічныя інстытуты з чатырохгадовым тэрмінам навучання (на базе сярэдняй школы) – рыхтавалі настаўнікаў 8–10 класаў.

Перад пачаткам Вялікай Айчыннай вайны падрыхтоўку настаўнікаў для агульнаадукацыйных школ ажыццяўлялі 32 вучэбныя педагагічныя ўстановы: 18 педагагічных вучылішчаў, 9 настаўніцкіх інстытутаў, 5 педагагічных інстытутаў [1, с. 94]. Усе вучэбныя ўстановы мелі дзённае і завочнае аддзяленні.

У выніку дзейнасці такой шырокай сеткі педагагічных вучэбных устаноў рэспубліка дасягнула істотных поспехаў у падрыхтоўцы настаўніцкіх кадраў для ўсіх ступеняў агульнаадукацыйнай школы. Большасць з 60 724 настаўнікаў, працаваўшых у агульнаадукацыйных школах, у перадваенным 1940/41 вучэбным годзе мелі сярэднюю і вышэйшую педагагічную адукацыю [2, л. 186].

За гады вайны і акупацыі агульнаадукацыйная школа рэспублікі, акрамя матэрыяльнага, панесла і істотны кадравы ўрон. Шмат настаўнікаў загінула, змагаючыся на фронце і партызанскіх злучэннях, частка была ў эвакуацыі. Многія з настаўнікаў, якія знаходзіліся на акупіраванай тэрыторыі, былі расстраляны, павешаны, вывезены на працу ў Германію. Аб маштабах рэпрэсій нямецкіх захопнікаў у дачыненні да настаўнікаў яскрава сведчыць той факт, што толькі ў Баранавіцкай вобласці фашысты знішчылі 248 настаўнікаў і 83 вывезлі ў Германію [3, л. 12]. Як паказаў час, каб ліквідаваць кадравы ўрон, нанесены школьнай адукацыі ў гады вайны і акупацыі, рэспубліцы спатрэбілася каля дзесяці гадоў.

З мэтай належнай падрыхтоўкі агульнаадукацыйных школ рэспублікі да пачатку 1944/45 вучэбнага года СНК БССР і ЦК КП(б)Б 18 красавіка 1944 года прынялі пастанову № 211/5 «Аб аднаўленні сеткі школ у вызваленых ад нямецкіх акупантаў раёнах БССР», у якой Народнаму Камісарыяту асветы рэспублікі было даручана да пачатку 1944/45 вучэбнага года ўкамплектаваць агульнаадукацыйныя школы педагагічнымі кадрамі. Прыняты савецка-партыйным кіраўніцтвам рэспублікі дакумент несумненна адыграў пэўную мабілізуючую ролю ў дзейнасці органаў адукацыі ўсіх узроўняў.

Выконваючы пастанову, наркамасветы летам 1944 г. накіраваў выклікі 6 238 настаўнікам, якія знаходзіліся ў эвакуацыі ва ўсходніх абласцях краіны, і арганізаваў шырокую сетку кароткатэрміновых

педагагічных курсаў па падрыхтоўцы настаўнікаў для пачатковых школ. Праз сістэму 3-х і 6-месячных курсаў было падрыхтавана і накіравана ў школы 1 619 настаўнікаў пачатковых класаў [2, л. 188].

Аднак, як сведчаць архіўныя дакументы, выканаць патрабаванне пастановы ў частцы забеспячэння школ неабходнай колькасцю настаўнікаў да пачатку вучэбнага года не атрымалася.

Так, школам Пінскай вобласці на пачатак 1944/45 вучэбнага года патрабаваўся 1 591 настаўнік. З іх 1334 настаўнікі для пачатковых класаў і 257 – для сярэдніх і старшых класаў. У наяўнасці ж быў толькі 641 настаўнік пачатковай школы і 93 настаўнікі-прадметнікі. У цэлым недахоп настаўнікаў у школах вобласці на пачатак вучэбнага года складаў 857 чалавек, або больш за 50 % ад патрэбнай колькасці [4, л. 148]. Па гэтай прычыне ў вобласці ў першым паўгоддзі не аднавілі дзейнасць 60 школ [5, л. 25]. Праблема адсутнасці настаўнікаў дапаўнялася нізкім узроўнем падрыхтоўкі тых, хто працаваў у школах. З 755 настаўнікаў пачатковых класаў 425, або 56 %, не мелі нават сярэдняй адукацыі. З 132 настаўнікаў 5–10 класаў 91 чалавек не мелі педагагічнай адукацыі [5, л. 53].

Надзвычай складаным было становішча з педагагічнымі кадрамі для агульнаадукацыйных школ і ў Баранавіцкай вобласці. На 1 студзеня 1945 г. у вобласці не хапала 530 настаўнікаў: у 1–4 класах – 349, у 5–7 – 139, у 8–10 – 42 чалавекі. Як следства, настаўнікі мелі вучэбную нагрузку па 35–50 гадзін. У шэрагу школ асобныя вучэбныя прадметы наогул не выкладаліся [5, л. 91]. З 2 799 працуючых настаўнікаў 1 401 чалавек (звыш 50 %) не мелі нават сярэдняй адукацыі [5, л. 92].

Прыкладна такое ж выключна вострае становішча з педагагічнымі кадрамі для сярэдніх агульна-адукацыйных школ было і ў іншых абласцях рэспублікі.

На пачатак 1944/45 вучэбнага года, па даных наркамасветы БССР, у школах рэспублікі працавалі 30 822 настаўнікі, або 57 % даваеннай колькасці. Нават пры павялічанай педагагічнай нагрузцы на кожнага з іх да поўнага камплектавання школ педагагічнымі кадрамі не хапала 6 745 настаўнікаў, з іх для пачатковых класаў – 4 768 і для 5–10 класаў – 1 977 настаўнікаў [2, л. 188].

Прыведзеныя вышэй статыстычныя даныя з архіўных крыніц аб становішчы з педагагічнымі кадрамі агульнаадукацыйных школ даюць падставу не пагадзіцца з інфармацыяй, якая ўтрымлівалася ў даведцы, накіраванай наркамам асветы БССР Е. І. Уралавай сакратару ЦК КП(б)Б В. М. Маліну «Аб стане работы па аднаўленні сеткі культурных устаноў па Беларускай ССР» ад 5 кастрычніка 1944 г. У даведцы, у прыватнасці, адзначалася, што сістэма школьнай адукацыі рэспублікі за выключна кароткі тэрмін змагла вырашыць усе пастаўленыя перад ёй задачы і якасна падрыхтавацца да пачатку вучэбнага года [6, с. 211].

Да канца першага паўгоддзя 1944/45 вучэбнага года становішча з забеспячэннем агульнаадукацыйных школ педагагічнымі кадрамі палепшылася толькі ў колькасным аспекце. На 1 студзеня 1945 г. агульная колькасць настаўнікаў, працуючых у школах рэспублікі, узрасла да 34 694. У той жа час адукацыйны цэнз педагагічных кадраў заставаўся выключна нізкім. Асабліва характэрным гэта было для настаўнікаў школ заходніх абласцей рэспублікі. У гэтых абласцях з 26 246 працуючых настаўнікаў вышэйшую адукацыю мелі 1 657 чалавек, або 6,3 %, незакончаную вышэйшую – 2 770, або 10,5 %, сярэднюю – 12 304, або 47 %, не мелі закончанай сярэдняй адукацыі – 5 609 чалавек, або 21,3 %. У параўнанні ў заходніх абласцях рэспублікі з 8 448 настаўнікаў вышэйшую адукацыю мелі толькі 410 чалавек, або 4,8 %, незакончаную вышэйшую – 667, або 7,9 %, сярэднюю – 3 662, або 43,3 %, не мелі закончанай сярэдняй адукацыі – 3 759 чалавек, або 45 % [2, л. 219]. Як сведчыць прыведзеная статыстыка, у школах усходніх абласцей рэспублікі каля 90 % настаўнікаў не мелі педагагічнай адукацыі і амаль палова не мела нават агульнай сярэдняй адукацыі.

Нягледзячы на ўсе намаганні партыйна-дзяржаўных структур, абласных, раённых аддзелаў народнай адукацыі, вырашыць праблему забеспячэння агульнаадукацыйных школ рэспублікі педагагічнымі кадрамі да пераможнага завяршэння Вялікай Айчыннай вайны так і не атрымалася.

Нездавальняючы стан аднаўлення школьнай адукацыі прымусіў СНК БССР і ЦК КП(б)Б прыняць у жніўні 1945 года сакрэтную пастанову № 1163–292 с «Аб мерапрыемствах па падрыхтоўцы школ да 1945/46 навучальнага года», у якой, у прыватнасці, адзначалася і нездавальняючая ўкамплектаванасць школ педагагічнымі кадрамі [7, л. 157]. З мэтай своечасовай падрыхтоўкі школ да 1945/46 вучэбнага года СНК БССР і ЦК КП(б)Б абавязалі «наркамасветы БССР да 15 жніўня 1945 г. укамплектаваць усе школы рэспублікі педагагічнымі кадрамі, правільна расставіць як ужо працуючых у школах настаўнікаў, так і скончыўшых

педагагічныя ВНУ і педвучылішчы, рээвакуіраваных з усходніх абласцей СССР і адазваных настаўнікаў, працуючых не па спецыяльнасці. Звярнуць асаблівую ўвагу на ўкамплектаванне настаўніцкімі кадрамі школ заходніх абласцей» [7, л. 158].

Трэба адзначыць, што, выконваючы патрабаванні вышэй названай пастановы, Народны Камісарыят асветы і яго органы на месцах да пачатку першага пасляваеннага вучэбнага года здолелі правесці пэўную работу па камплектаванні агульаадукацыйных школ педагагічнымі кадрамі. Калі ў канцы 1944/45 вучэбнага года ў школах рэспублікі працавала 35 036 настаўнікаў, то ў пачатку 1945/46 вучэбнага года іх колькасць узрасла да 41 443 чалавек. Такім чынам, колькасны склад педагагічных кадраў, якія забяспечвалі вучэбны працэс у школах, узрос на 6 407 чалавек, або на 18,2 %. Трэба адзначыць, што павелічэнне ў асноўным адбылося за лік асоб, якія не толькі не мелі педагагічнай адукацыі, а нават сярэдняй. З агульнай колькасці працуючых у школах настаўнікаў не мелі педагагічнай адукацыі 16 936 чалавек, або 40 %. Як правіла, гэта былі настаўнікі сельскіх пачатковых школ. Якасны склад педагагічных кадраў палепшыўся за лік настаўнікаў, дэмабілізаваных з Чырвонай Арміі і выпускнікоў сярэдніх і вышэйшых педагагічных вучэбных устаноў. Калі ў канцы 1944/45 вучэбнага года ў школах рэспублікі працавала 2 414 настаўнікаў з вышэйшай педагагічнай адукацыяй і 18 113 – з сярэдняй педагагічнай адукацыяй, то ў пачатку 1945/46 вучэбнага года колькасць першых склала 2 940, другіх – 21 567 чалавек. Павелічэнне колькасці настаўнікаў з вышэйшай адукацыяй склала 526 чалавек, або 22 %, з сярэдняй педагагічнай адукацыяй – 3 454 чалавекі, або 19 % [8, л. 70].

Аднак, нягледзячы на прынятыя меры, школы рэспублікі на пачатак 1945/46 вучэбнага года адчувалі вострую патрэбу ў настаўніках, асабліва з прафесійнай падрыхтоўкай. Для поўнага камплектавання настаўнікамі школ Маладзечанскай вобласці патрабавалася 830 настаўнікаў [9, л. 138], Пінскай вобласці – 822 настаўнікі [9, л. 130], Баранавіцкай вобласці – 510 [9, л. 138], Палескай вобласці – 420 [9, л. 73], Мінскай вобласці – 322 настаўнікі [9, л. 32].

У цэлым па рэспубліцы некамплект педагагічных кадраў для агульнаадукацыйных школ на пачатак 1945/46 вучэбнага года складаў 4 500 настаўнікаў [9, л. 138]. Па гэтай прычыне многія школы не працавалі. Так, у Пінскай вобласці не працавалі 28 пачатковых школ, у Мінскай вобласці – 13 школ [9, л. 138].

Да канца вучэбнага года становішча з забяспечанасцю школ настаўнікамі крыху палепшылася. Калі ў пачатку 1945/46 вучэбнага года ў агульнаадукацыйных школах працавалі 41 443 настаўнікі, то ў канцы яго – 45 332 [10, л. 5]. Што тычыцца якаснага складу педагагічных кадраў, то ён істотна не змяніўся. З агульнай колькасці працуючых у агульнаадукацыйных школах настаўнікаў 13 330 чалавек, або амаль 30 %, не мелі нават сярэдняй адукацыі, што адмоўна сказвалася на паспяховасці навучэнцаў [10, л. 80].

У пэўнай ступені адмоўна на арганізацыю вучэбнага працэсу ў школах уплываў стан матэрыяльнага і бытавога забеспячэння настаўнікаў. Нягледзячы на неаднаразовае абмеркаванне і прыняцце пастаноў на ўзроўні рэспубліканскіх, абласных і раённых улад, пытанне забеспячэння настаўнікаў вырашалася вельмі складана, а падчас наогул не вырашалася. Пацверджаннем таму з'яўляецца справаздача аддзела школ Пінскага абкама КП(б)Б аб рабоце школ вобласці ў першым паўгоддзі 1945/46 вучэбнага года. У ёй адзначалася, што ў большасці раёнаў вобласці забеспячэнне настаўнікаў прадуктамі харчавання і прамысловымі таварамі знаходзіцца ў нездавальняючым стане. Многія настаўнікі не мелі магчымасці набыць абутак і вопратку. У Столінскім, Драгічынскім, Ленінскім раёнах вобласці настаўнікі па 3–4 месяцы не атрымлівалі нават хлебнага пайка. У асобных гарадах (Пінск, Драгічын) настаўнікі жылі ў выключна складаных кватэрных умовах, не мелі лямп, газы, паліва [9, л. 3]. Нездавальняючае выкананне ўрадавай пастановы аб забеспячэнні настаўнікаў у першым паўгоддзі першага пасляваеннага вучэбнага года адзначалася аддзеламі школ абкамаў КП(б)Б усіх абласцей рэспублікі.

Нізкі прафесіянальны ўзровень настаўнікаў, дрэнны стан іх матэрыяльнага і бытавога забеспячэння, нездавальняючыя ўмовы навучання негатыўна сказваліся на арганізацыі вучэбнага працэсу і, як вынік, на паспяховасці навучэнцаў. Аб гэтым сведчаць адзнакі апошніх, атрыманыя па выніках першага паўгоддзя 1945/46 вучэбнага года. У Гомельскай вобласці з 2066 навучэнцаў 8–10 класаў адзнаку «4» і «5» атрымалі толькі 24 вучні, адзнаку «3» – 762, адзнаку «2» атрымалі 1280 вучняў, або 57 % ад агульнай колькасці навучэнцаў. У Баранавіцкай вобласці з 2090 навучэнцаў 8–10 класаў адзнаку «4» і «5» не атрымаў ніхто.

Не лепшай была паспяховасць вучняў па ўсіх класах і ў астатніх абласцях. Найбольшая колькасць вучняў не паспявала па беларускай і рускай мовах і матэматыцы [8, л. 53].


**БІБЛІЯГРАФІЧНЫ СПІС**

1. Андарала І. А. Агульнаадукацыйная школа і педагагічная адукацыя ў БССР (30-я гг. XX ст.) / І. А. Андарала // Весці БДПУ, Сер. 2 – 2016. – № 2. – С. 89–94.
2. НАРБ. – Ф. 4 п. Воп. 17. Спр. 21.
3. НАРБ. – Ф. 4 п. Воп. 17. Спр. 34.
4. НАРБ. – Ф. 4 п. Воп. 17. Спр. 30.
5. НАРБ. – Ф. 4 п. Воп. 17. Спр. 28.
6. Освобожденная Беларусь. Документы и материалы: в 2 кн. Кн. 1. Сентябрь 1943 – декабрь 1944 / сост.: В. И. Адамушко [и др.]. Минск, 2004. – 398 с.
7. НАРБ. – Ф. 42 сч. Воп. 6. Спр. 6.
8. НАРБ. – Ф. 4 п. Воп. 17, Спр. 43.
9. НАРБ. – Ф. 4 п. Воп. 17, Спр. 40.
10. НАРБ. – Ф. 4 п. Воп. 17, Спр. 102.


# ОСОБЕННОСТИ ПРЕПОДАВАНИЯ ИСТОРИИ В РАЗЛИЧНЫХСТРАНАХ МИРА


***А. И. Богданович,***
*кандидат исторических наук,*
*доцент, доцент кафедры истории*
*белорусской государственности БНТУ;*
***И. И. Богданович,***
*кандидат педагогических наук,*
*доцент кафедры всеобщей истории*
*и методики преподавания истории БГПУ*


Представить все многообразие вариантов изучения истории, что существуют в мире сложно. Специфика ее преподавания в различных странах существенно отличается. Поэтому остановимся на анализе основных тенденций в преподавании истории в ведущих европейских странах и США, так как система исторической образования нашей страны развивается в контексте общеевропейских традиций. Преподавание истории в разных странах мира осуществляется по-разному, однако есть что-то общее, что объединяет различные модели исторического образования. Это, прежде всего то, что история накладывает существенный отпечаток на формирование мировоззрения среднестатистического ученика, на формирующуюся у него систему ценностей, на его отношение к другим народам, к их истории и культуре в целом [1, с. 7].

Система исторического образования в Северной Америке направлена на воспитание у подрастающего поколения гражданских и патриотических чувств, достоинства и гордости за принадлежность к гражданству Соединенных Штатов, как государства, основанного на принципах истинной свободы, демократии и справедливости, государства, что имеет все возможности и моральное право диктовать остальному миру приоритеты его развития и образа жизни.

В школах у учеников формируется представление об исключительной роли США в мире. В американских школах отечественная история доминирует, а история других народов изучается только в той степени, в которой они попадают в сферу американских интересов. В содержании исторического образования преобладает детальное изучение возникновения США и деятельность президентов от первого до последнего. При этом американцы откровенно идеализируют свои историческое прошлое и тщательно умалчивают досадные ошибки своих президентов и не очень удачные политические доктрины.